УДК 930.25:737.1(476)

# АРХІЎНЫЯ ДАКУМЕНТЫ XIX СТ. АБ ВЫПАДКАХ ЗНАХОДЖАННЯ МАНЕТНЫХ СКАРБАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***І. Н. Колабава,***
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Разглядаюцца архіўныя матэрыялы, якія зафіксавалі сведчанні адкрыцця на беларускіх землях манетных скарбаў, не ўведзеных яшчэ ў навуковы зварот. Грашовыя дэпазіты з'яўляюцца адной з самых інфарматыўных нумізматычных крыніц. Даследаванне скарбавага матэрыялу робіць значны ўнёсак у вывучэнне разнастайных сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных аспектаў беларускай гісторыі. Апісанне абставін знаходжання грашовых дэпазітаў з шэрагам побытавых дэталей, характарыстыка ўзаемных стасункаў паміж людзьмі ў сітуацыі выпадковай знаходкі, правядзенне следчых мерапрыемстваў пры выяўленні факта ўтойвання знаходжання грашовага скарбу ствараюць магчымасць папоўніць базу крыніцы рэсурсу па гісторыі грашовага абарачэння на тэрыторыі Беларусі.

**Ключавыя словы:** грашовае абарачэнне, беларускія землі, манетны скарб, расійскае заканадаўства, XIX ст., дачыненне да грашовых скарбаў, нумізматычныя даследаванні, археалагічная камісія.

# ARCHIVE DOCUMENTS OF THE 19TH CENTURY ON CASES OF FINDING COIN TREASURES ON THE TERRITORY OF BELARUS

***I. Kolabava,***
*PhD in History, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Historical and Cultural Heritage of the Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The presented article examines archival materials that recorded evidence of the discovery of coin hoards on Belarusian lands that have not yet been put into scientific circulation. Monetary deposits are one of the most informative numismatic sources. The study of hoard material makes a significant contribution to the study of various socio-economic, political and cultural aspects of Belarusian history. A description of the circumstances of the discovery of cash deposits with a number of everyday details, a characterization of the mutual relations between people in a situation of an accidental find, and the conduct of investigative measures when the fact of concealment of the finding of a cash treasure is revealed create an opportunity to replenish the base of source resources on the history of monetary circulation in Belarus.

**Keywords:** money circulation, Belarusian lands, coin hoard, Russian legislation, 19$^{th}$ century, attitude towards coin hoards, numismatic research, archaeological commission.

Грашовы скарб, з'яўляючыся багатай інфармацыйнай крыніцай, утрымлівае шмат звестак аб сацыяльна-эканамічным, палітычным, тэхнічным, культурным развіцці дзяржавы. Акрамя гэтага, стварэнне грашовага скарбу ў пэўныя перыяды гісторыі стала для розных груп насельніцтва фактычна адзіным спосабам захавання каштоўнасцей.

Паўнавартасныя нумізматычныя даследаванні немагчымы без выкарыстання пісьмовых крыніц, якія дазваляюць дапоўніць працэс вывучэння гісторыі грашовага абарачэння на беларускіх землях вельмі значным фактычным матэрыялам, які звязвае грошы з самымі рознымі рэаліямі жыцця грамадства.

У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск) у матэрыялах дзяржаўных органаў на тэрыторыі Беларусі XIX ст. захавалася не апублікаваная інфармацыя аб выпадках знаходжання манетных дэпазітаў [1].

24 жніўня 1861 г. у Мінскай палаце крымінальнага суда пачаўся разгляд справы аб знойдзеным сялянкай Акулінай Цэндавай з в. Рубля Мазырскага павета грашовым скарбе, «который обманным образом отобран от нея Рубельским священником Смородским» [2, арк. 1].

Вельмі заблытаная гісторыя гэтай знаходкі распачалася яшчэ ў 1855 г., калі 25 верасня адміністратар сядзібы князя Радзівіла Галаўня абвясціў прыстава 3-га стана Мазырскага павета, што сялянка в. Рубля Акуліна Цэндава адкрыла скарб [Там жа, арк. 37].

Па версіі галоўнага фігуранта справы Акуліны Цэндавай, 13 верасня 1855 г., яна, капаючы яму для бульбы, знайшла ў зямлі глінянае начынне памерам у паўтара гарнца (прыб. 3,27 л), напоўненае манетамі «серебряными величиною в рубль и менее и желтого цвета величиною в нынешний полуимпериал и старинный червонец. При вынутии из земли сосуд разломался на несколько частей» [2, арк. 37–38 адв.]. Сабраныя манеты Акуліна схавала ў адрыне ў дзіцячай кашулі і вярнулася да працы, запрасіўшы на дапамогу нейкую Аўдзюшку і яе сваяка Мацвея. На пытанне памочнікаў, адкуль у яме чарапкі, яна распавяла пра знаходку скарбу. На наступны дзень да яе мужа дайшлі вясковыя чуткі пра знойдзеныя грошы. Акуліна прызналася яму ў знаходжанні грошай, але куды іх схавала не сказала. Праз некалькі дзён святар Смародскі, якога яна сустрэла на вуліцы, параіў ёй ахвяраваць частку грошай на службу і будаўніцтва званіцы. Спачатку яна не згаджалася, але потым вырашыла аднесці грошы святару, што і зрабіла 18 верасня. Нібыта пры сведках – маці і жонцы святара – Акуліна пакідае святару торбу з грашыма. Той жа паабяцаў Акуліне «с наступлением зимы отправиться с [её] мужем в г. Минск и променять деньги на ходячую монету, её же защищать от взыскания за утайку» [Там жа, арк. 39].

Трэба адзначыць, што святар Смародскі, нягледзячы на абвінавачанні Акуліны і паказанні ўскосных сведкаў, ніколі не згаджаўся з тым, што браў у Цэндавай нейкія грошы.

У далейшым Цэндава некалькі разоў кардынальна мяняла свае паказанні, пашыраючы кола вінаватых у знікненні скарбу. Да того ж Акуліна скардзілася, што святар Смародскі ўчыніў ёй пабоі, адмаўляў у споведзі і прычашчэнні, патрабаваў паклясціся на Евангеллі, што яна насамрэч перадала яму грошы, а калі ў яе памерла дзіця, то святар увогуле адмовіўся удзельнічаць ў пахаванні [Там жа, арк. 40–40 адв.]. Цэндава таксама паведаміла, што «золотой монеты было с полкварты» (кварта – нязначна больш за літр) і ўсе манеты пераклала яна ў два збаны «один величиною в гарнец, а другой в кварту, зарыла их под печкой, оставшиеся деньги в рубашке отнесла к священнику Смородскому, ...означенные два кувшина отдала Бейли Зингермановой: один большой с серебряной монетою на следующую после находки весну, а другой с золотою, после пожара в 1859 г.» [Там жа, арк. 54].

Сведкі ж па справе паказвалі, што, па словах Акуліны, яна грошай Смародскаму не давала, а прынесла яму толькі некалькі штук для вызначэння іх вартасці. А ў царкве на пытанне святара,

навошта яна ўзвяла на яго паклёп, тая прызналася, што «денег ему не отдавала и оклеветала по наговору администратора Головни» і ў далейшым некалькі разоў прылюдна прасіла ў Смародскага прабачэння за свой паклёп [2, арк. 43, 45, 54].

Цікавую інфармацыю аб Акуліне дадаў і яе муж Раман, які прыкмеціў узбагачэнне штодзённага харчавання гавядзінай, рыбай і іншымі прадуктамі. На пытанне ж, адкуль гэта бярэцца, Акуліна адказала, што гэта яго не датычыць [Там жа, арк. 56].

Па справе Акуліны Цэндавай двойчы прымаліся судовыя рашэнні. У 1860 г. Мазырскі павятовы суд вынес пастанову аб тым, што «крестьянку помещика Радзивилла Акулину Никитину Цендову 32 лет, нашедшую деньги, с давних времен закопанные в земле, по необнаружению умысла на утайку оных... от всяческих взысканий освободить... Священника же... Фёдора Смородского, не оправдавшегося вполне и …прямо не обличающегося в принятии под охранение найденных крестьянкою денег ...оставить в подозрении». Пакаранню падвергліся і служачыя земскай паліцыі за «медленность в производстве сего дела» [Там жа, арк. 46–47 адв.].

Мінская крымінальная палата прымае канчатковае рашэнне і пастанаўляе, што ўлічваючы неаднаразовыя змены паказанняў Акуліны Цэндавай, лічыць іх паклёпам, а падвергнутыя паклёпу маюць права падаць за гэта ў суд скаргу; за тое, што на правядзенне следчых мерапрыемстваў ад спраў адрывалася шмат службовых асоб і выдаткаваліся грошы, было палічана справядлівым пакаранне Акуліны Цэндавай у 3 месяцы арышту і выплаце выдаткаваных на камандзіроўкі па ходу следства 50 рублёў прагонных і 62 руб. 50 кап. сутачных. Скарга сялянкі на невыкананне святаром Фёдарам Смародскім сваіх абавязкаў была перададзена на разгляд Мінскай Духоўнай Кансісторыі. За няпраўдзівыя паказанні маці Цэндавай – Настасся Якімаўна была арыштаванана 3 тыдні [Там жа, арк. 61–61 адв.].

Так скончылася справа пра манетны дэпазіт, які па ўскосных даных усё ж такі быў рэальна знойдзены, але надзейна схаваны ад следства.

Яшчэ адзін выпадак знаходжання манетнага скабру адбыўся ў в. Ржавіца Лабанаўскай воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні ў 1879 г. У рапарце магілёўскаму губернатару ад 27 жніўня 1879 г. чэрыкаўскі павятовы спраўнік паведамляе, што «7 сего августа на поле около деревни Ржавица дочерью крестьянина ...Ильи Евменёва – Ульяною найдены в земле, в разбитом горшке, старинные монеты, по-видимому, смесь серебра

с медью, весом 3 ¼ фунта, счётом 1108 штук» [3, арк. 1]. Далей у рапарце паведамляецца, што манеты былі адпраўлены па інстанцыях з просьбай ад селяніна Іллі Яўмянёва «представить их начальству и в случае принятия – выдать законное вознаграждение, а в противном случае возвратить их для продажи частному лицу» [Там жа, арк. 1–1 адв.].

У справе знаходзіўся і акт прыёму гэтага манетнага скарбу ад 28.08.1879 г. У адпаведнасці з ім «при вскрытии тюка с... старинными, по-видимому, серебряными монетами ...оказалось ...1101 монета ...весом три и три восьмых фунта» [Там жа, арк. 2]. Манеты былі перададзены ў Магілёўскае губернскае праўленне, якое на падставе таго, што па заканадаўстве знойдзеныя грошы «принадлежат владельцу земли, на которой найдены», вырашае «возвратить их чериковскому уездному исправнику...» для далейшых дзеянняў [Там жа, арк. 4]. Тым не менш у дадзеным выпадку парушэнне закону ўсё ж адбылося. Тагачаснае заканадаўства прадугледжвала абавязковую перадачу знойдзеных манет у Імператарскую Археалагічную камісію (1859–1917), якая займалася рэгістрацыяй і даследаваннем скарбу, а таксама вызначала суму выплаты знаходчыку.

На беларускіх землях з XIX ст. зафіксавана адкрыццё больш за 1,5 тыс. грашовых скарбаў, праўда, далёка не ўсе яны на наш час знаходзяцца ў музейных фондах. Акрамя гэтага, шмат скарбаў увогуле засталося без рэгістрацыі. Археалагічная камісія на захаванне пакідала толькі самыя цікавыя манеты, а астатняе магло быць выстаўлена на продаж калекцыянерам, вернута знаходчыку ці, у асобных выпадках, адпраўлена на манетны двор для пераплаўкі.

Знаходжанне грашовых дэпазітаў адбываецца заўсёды выпадкова і пры самых розных абставінах. Адсутнасць аднолькавых па якасных і колькасных паказчыках скарбаў робіць кожны з іх унікальнай крыніцай ведаў.

Публікацыі новых звестак аб знойдзеных грашовых скарбах пашыраюць крыніцазнаўчую базу, неабходную для далейшага даследавання праблематыкі гісторыі грашовага абарачэння на беларускіх землях.

1. *Колабава, І. Н.* Архіўныя дакументы XIX – пачатку XX ст. аб знаходках манетных скарбаў на тэрыторыі Беларусі і набліжаных рэгіёнаў / І. Н. Колабава // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы

навук. канф., Віцебск, 23–24 кастр. 2014 г. / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, Віцебскі абласны краязнаўчы музей ; рэдакц. калегія: Г. У. Савіцкі [і інш.]. – Віцебск, 2017. – С. 90–98.

*2.* Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск) (НГАБ). – Ф. 145. Воп. 2. Спр. 768. 104 арк.

*3.* НГАБ. – Ф. 2003. Воп. 1. Спр. 519. 5 арк.